УДК 94(476,1)"1812"

# СТРАТЫ КАШТОЎНАСЦЕЙ НЯСВІЖСКАГА ПАЛАЦА Ў 1812 г. У КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

***М. А. Дубатоўка,*** *аспірант дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», адміністратар Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь*

**Анатацыя.** Тэрыторыя сучаснай Беларусі шмат стагоддзяў была месцам сутыкнення інтарэсаў розных дзяржаў і ваенных канфліктаў паміж імі, і вайна 1812 г. не стала выключэннем. Сярод бясконцых разбурэнняў нельга не адзначыць і знішчэнне беларускай культурнай спадчыны. Яскравым прыкладам такіх працэсаў з'яўляецца рабаванне Нясвіжскага палаца, унесенага ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Магнаты роду Радзівілаў, уладары палаца, валодалі велізарнымі грашовымі сродкамі і, адпаведна, магчымасцямі запрашаць працаваць замежных майстроў у Нясвіж. Дзякуючы гэтаму культура беларускіх зямель у XVI–XVIII стст. развівалася ва ўлонні агульнаеўрапейскага кантэксту: тут былі знаёмыя ідэі Паўночнага Адраджэння, эпохі Асветы. А буйныя магнацкія рэзідэнцыі станавіліся квітнеючымі культурнымі цэнтрамі. Знікненне каштоўнасцей Нясвіжскага палаца падчас вайны 1812 г. з'яўляецца стратай не толькі для Беларусі, але і для еўрапейскай культурнай спадчыны ўвогуле.

**Ключавыя словы:** вайна 1812 г., Нясвіжскі палац, беларускія каштоўнасці, еўрапейская культурная прастора.

# LOSS OF VALUES OF THE NESVIZH PALACE IN 1812 IN THE CONTEXT OF THE EUROPEAN CULTURAL SPACE

***M. Dubatouka,*** *Postgraduate student of the Educational Establishment «Republican Institute of Higher Education», administrator of the National Historical Museum of the Republic of Belarus*

**Abstract**. For many centuries, the territory of modern Belarus was a place of conflict between the interests of different states and military conflicts between them, and the war of 1812 was no exception. Among the endless losses is the destruction of the Belarusian cultural heritage. A striking example of such processes is the plundering of the Nesvizh Palace, included in the UNESCO World Heritage List. The magnates of the Radziwill clan, the owners of the palace, had huge funds and, accordingly, opportunities to invite foreign masters to work in Nesvizh. Thanks to this, the culture of Belarusian lands in the XVI–XVIII centuries developed in the light of the pan-European context: the ideas of the Northern Renaissance and the Enlightenment were familiar here. And large magnate residences became prosperous cultural centers. The disappearance of the values of the Nesvizh Palace during the war of 1812 is a loss not only for Belarus, but also for the European cultural heritage in general.

**Keywords:** war of 1812, Nesvizh Palace, Belarusian values, European cultural space.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да вывучэння гэтай праблемы ўжо не аднойчы звярталіся беларускія і замежныя гісторыкі ў кантэксце як гісторыі сям'і Радзівілаў і Нясвіжскага палаца, так і ў рамках асэнсавання разбурэння і шкоды, што прынесла вайна 1812 г. [2; 3; 6; 9; 8; 10]. Да таго ж у нашым распараджэнні ёсць шэраг важных гістарычных крыніц (рэестры скарбу, мемуары непасрэдных удзельнікаў і г. д.), якія дазваляюць скласці досыць аб'ектыўную карціну падзей 1812 г. у Нясвіжскім замку [18; 19]. Аднак, на жаль, у навуковым звароце адсутнічаюць крыніцы, якія маглі б дакладна паказаць перамяшчэнні скарбаў і іх канчатковае месцазнаходжанне, што падштурхоўвае даследчыкаў працягваць пошукі.

Гісторыя Нясвіжа ў 1812 г. звязана з імем Дамініка Радзівіла. Дамінік Геранім Радзівіл (1786–1813) быў XI ардынатам нясвіжскім і, як скалалася, апошнім прадстаўніком мужчынскай лініі знакамітага роду. Калі ўладанні Напалеона пашырыліся да межаў Расійскай імперыі і стала зразумела, што канфлікту не пазбегнуць, Д. Радзівіл у 1810 г. паступае на службу створанага Напалеонам Княства Варшаўскага, а ў 1811 г. са сваім восьмым уланскім палком пераходзіць пад кіраўніцтва французскага імператара ў чыне падпалкоўніка [16, с. 100]. Адна з нагодаў такога кроку князя Радзівіла заключаецца ў няўдалай палітыцы, якую праводзіў царскі ўрад на далучаных пасля падзелаў Рэчы Паспалітай тэрыторыях. Новы адміністратыўна-тэрытарыяльны падзел зямель, ажыццяўленне іншай эканамічнай палітыкі, правядзенне разбору шляхты – усё гэта аддаляла заможных магнатаў былой магутнай дзяржавы Еўропы ад расійскага цара. Францыя ж выклікала сімпатыі ў тутэйшых шляхціч аў, бо дала прытулак шматлікім эмігрантам, якія пакінулі радзіму пасля падзей, звязаных з падзеламі Рэчы Паспалітай і паўстаннем 1794 г. [14, с. 120–121]. Не будзем таксама забываць пра абяцанне Напалеона аднавіць Вялікае Княства Літоўскае [10, с. 164]. Выбар князя Дамініка быў відавочна абумоўлены гэтым.

Дамінік стаў нашчадкам велізарных багаццяў. Згодна з рэестрам, скарбніца Радзівілаў проста ўражвае. Там змяшчаліся палотны майстроў жывапісу XVI–XVIII стст., прычым існуе легенда, што Мікалай Радзівіл Сіротка запрашаў Рэмбрандта для арганізацыі карціннай галерэі палаца, і мастак нават напісаў у Нясвіжы некалькі сваіх работ [13, с. 8]. Акрамя таго, у палацы знаходзіліся калекцыя рыцарскіх даспехаў з Францыі, Італіі, Іспаніі, узбраенне, збор ордэнаў і медалёў. Таксама спіс каштоўнасцей змяшчаў нумізматычную калекцыю, перапіску Радзівілаў з еўрапейскімі манархамі, гістарычныя дакументы Вялікага Княства Літоўскага і, канешне, знакамітую бібліятэку Радзівілаў на 20 тыс. тамоў. Гэта не ўсё: збор змяшчаў дарагія наборы посуду з каштоўных металаў, срэбраны стол, калекцыю дыямантаў, залатыя злiткі [13, с. 9–10]. Багацці князёў Радзівілаў былі бясконца вялікія, і ў такім стане маёмасць атрымаў у спадчыну князь Д. Радзівіл.

Сярод каштоўнасцей палаца даследчыкаў розных эпох заўсёды цікавілі залатыя фігуры апосталаў, якія быццам зніклі з Нясвіжа менавіта ў 1812 г. На вялікі жаль, звестак пра іх з'яўленне, знешні выгляд і знікненне захавалася вельмі мала. Існуе малаверагодная версія аб тым, што яны былі прывезеныя ў XVII ст. у Нясвіж з Канстанцінопаля Жыгімонтам-Каралем Радзівілам, сынам Мікалая Кшыштафа Радзівіла [6, с. 114]. Сведчанні пра апосталаў можна сустрэць ва ўспамінах людзей, якім пашчасціла ўбачыць багатую скарбніцу Радзівілаў. Вядома, што апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Панятоўскі заязджаў у Нясвіж да Караля Радзівіла. Пазней рускі князь М. Рапнін, які суправаджаў Панятоўскага на сойме ў Гародні, пісаў Кацярыне II такія словы: «Кароль заехаў да К. С. Радзівіла ў Нясвіж. Пасля бліскучага феерверку і абеда на 300 асоб кароль спусціўся ў сутарэнні замка і пабачыў зліткі золата, складзеныя да звода падзямелля. Золата было сотні пудоў, мноства старажытных залатых рэчаў і дванаццаць апосталаў з гэтага металу і срэбра, аздобленых каштоўнымі камянямі» [18, с. 16]. У 1868 г. у Варшаве выйшлі ў свет мемуары Міхала Казіміра Агінскага, дзе ён згадвае фігуры апосталаў: «Гэтыя статуі яны вазілі з сабою. Калі прагуляюць дзе ці хочуць прыдбаць новыя маёнткі, то закладваюць аднога з дванаццаці апосталаў, але заўсёды выкупляюць яго назад» [12, с. 112].

Баявыя дзеянні ў 1812 г. распачаліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Калі французскі імператар з рэшткамі войску пачаў адступаць назад, Радзівіл рушыў з імі [20, с. 100]. Тут разгортваюцца падзеі, якія выклікаюць спрэчкі і сёння. Армія Напалеона везла з сабою на захад нарабаваныя скарбы з Масквы (музейныя рэліквіі, царкоўнае начынне, карціны). Рабавалі каштоўнасці французы, а пасля іх перакупіў князь Радзівіл [12, с. 18]. Па дарозе на захад Дамінік заехаў у свой палац у Нясвіжы. Там ён даў загад аканому Адаму схаваць частку скарбаў у спецыяльнае патаемнае месца, пра якое ведалі толькі князь і аканом, а астатнія абозы з каштоўнасцямі адправіць за ім, бо Дамінік бег у бок Вільна. Аднак аканом не паспеў выканаць загад свайго гаспадара: у Нясвіж уступілі войскі адмірала Чычагава [19, с. 50].

Каб паспрабаваць прасачыць лёс незлічоных каштоўнасцей замка ў 1812 г., неабходна звярнуцца да ўспамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей. Такіх карысных звестак да сённяшняга часу дайшло няшмат. Тут спадручна ўзгадаць ліст адмірала П. В. Чычагава да імператара Аляксандра I: «В Несвиже я узнал, что кн. Доминик Радзивилл, который сформировал полк для Наполеона, позволил себе всякого рода косвенные клеветы, что он отправил некоторые ценные вещи, которые должны были служить доказательством разграбления, совершенного ими в Москве. Чтобы несколько отомстить, я позволил порыться в некоторых погребах его дома: там нашли сокровища: жемчуг, бриллианты и пр. Я увез что мог, это будет сложено в Бобруйске, дабы Ваше Величество изволили решить, что с этим делать. Я ничего не видел, но говорят, что есть вещи, достой-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ные музеев. Все ценят более миллиона рублей» [5, с. 50]. Далей па загадзе Чычагава скарбы на трынаццаці брычках былі вывезены ў Мінск, а пасля ў Маскву, Харкаў, Пецярбург [15, с. 116].

Калі руская армія восенню заняла Нясвіж, камандзір 14-га егерскага палка А. І. Красоўскі так напісаў у сваім данясенні пра маёмасць, скрадзеную з Масквы: «Неприятель не ждал атаки и очистил город, в котором обнаружено больше чем на миллион драгоценностей, бриллиантов и жемчугов, награбленных в Москве и привезённых в Несвиж на сохранение» [15, с. 19].

Што да лёсу архіва роду Радзівілаў у Нясвіжы, час вайны 1812 г. застаўся па-за ўвагай даследчыкаў [11, с. 103]. Часткова архіў Нясвіжскага замка быў вывезены ў Няборава [21, с. 48], часткова знішчаны прама на месцы [8, с. 63]. Захаваліся пазнейшыя сведчанні аб тым, што безліч актаў і папер з архіва падчас вайны былі раскіданыя па дзядзінцы і замкавых валах, а ў саміх памяшканнях хадзілі наўпрост па дакументах, якіх было насыпана да пояса [9, с. 51–52]. Салдаты дазвалялі сабе рэзаць пергамент і выкарыстоўваць яго для рамонту падцяжак. Апрача таго, дакументы архіва замянялі дровы для абагрэву палаца [8, с. 62], а «...другие документы исторической важности похищены разными лицами. Печати, не только украшенные алмазами, но и медные, какие только были и имели приятную наружность, тогда от документов оторваны» [4, с. 160].

Што да астатніх скарбаў палаца Радзівілаў, даследчыкі, якія займаліся непасрэдна гісторыяй каштоўнасцей Нясвіжа, усё ж такі прытрымліваюцца меркавання, што рускія афіцэры, якія ўзялі Нясвіж у канцы 1812 г., адправілі частку каштоўнасцей у цэнтральныя губерні Расійскай імперыі, а частку прысвоілі. Магчыма, гэта версія максімальна набліжана да праўды, бо мае дакументальныя пацвярджэнні, прыведзеныя вышэй. Таксама некаторыя рэчы (дакументы архіва) былі знішчаны адразу на месцы.

Такім чынам, скарбы палаца ў Нясвіжы з'яўляюцца агульнаеўрапейскім культурным здабыткам. Магнацкія рэзідэнцыі на тэрыторыі Беларусі станавіліся сапраўднымі культурнымі цэнтрамі, дзе працавалі мясцовыя і замежныя майстры, месціліся багатыя зборы каштоўных рэчаў. Знішчаныя каштоўнасці немагчыма вярнуць. Аднак некаторыя рэчы проста змянілі сваё месцазнаходжанне па розных суб'ектыўных прычынах, якія сёння не адыгрываюць ніякай ролі. Гэты факт дае даследчыкам нагоду працягваць пошукі зніклых каштоўнасцей. Узбагачэнне беларускіх аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны творамі выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва павышае айчынны культурны патэнцыял, робіць краіну прывабнай для замежных даследчыкаў, турыстаў, а таксама нагадвае сучаснаму пакаленню пра важнасць захавання мінулага сёння. Гэта неад'емная частка калектыўнай гістарычнай памяці еўрапейскай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Антонава, Т.* Ці стане Нясвіж турыстычнай Мекай? / Т. Антонова // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 1. – С. 63–67.

2. *Асіноўскі, С. М.* Загадка дванаццаці апосталаў Нясвіжскага замка / С. М. Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 2006. – № 2. – С. 107–119.

3. *Бакуменко, М. Н.* Сокровища в огне войны / М. Н. Бакуменко. – Минск : Беларусь, 1990. – 232 с.

4. *Веремейчик, А. Е.* Несвижский замок в судьбе трех российских военачальников / А. Е. Веремейчик // Воен.-ист. журн. – 2009. – № 10. – С. 38–41.

5. *Калубовіч, А.* Мова ў гісторыі беларускага пісьменства : у 2 ч. / А. Калубовіч. – Ч. 1. – Мюнхен ; Лондан, 1974–1975. – 84 с.

6. *Кламин, Я.* История Радзивилловских сокровищ = The History of the Radzivill's Treasures : ист. очерк / Я. Кламин ; [пер. В. Куницкого]. – Несвиж : Слуцкая укрупн. тип., 2002. – 20 с.

7. *Клепікаў, М. Я.* Румянцаўскі гурток і ахова помнікаў гісторыі і культуры Беларусі / М. Я. Клепікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2003. – № 1. – С. 60–66.

8. *Латушкін, А. М.* Да гісторыі Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у 1790–1818 гг. / А. М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік. – 2005. – № 6. – С. 46–60.

9. *Латушкін, А. М.* Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва Радзівілаў у другой палове XVIII – першай палове XX стагоддзя / А. М. Латушкін // Архівы і справаводства. – 2007. – № 2. – С. 102–107.

10. *Лукашэвіч, А. М.* 1812 год і Беларусь / А. М. Лукашэвіч // Беларуская думка. – 2002. – № 2. – С. 119–124.

11. *Мальдис, А. И.* Белорусские сокровища за рубежом / А. И. Мальдис. – Минск : Літ. і Маст., 2009. – 208 с.

12. *Метельский, А. А.* Владельцы старого Несвижа / А. А. Метельский. – Минск : Беларус. Энцыкл. ім. П. Броўкі, 2011. – 160 с.

13. *Ненадавец, А. М.* Дзе яны, скарбы рода Радзівілаў? / А. М. Ненадавец // Беларуская думка. – 2007. – №8 – С. 109–115.

14. *Несцярчук, Л. М.* Беларусь у вайне 1812 года. Паміж Напалеонам і Аляксандрам / Л. М. Несцярчук. – Брэст : Паліграфіка, 2012. – 320 с.

15. Отечественная война 1812 года : энцикл. – М. : РОССПЭН, 2004. – 880 с.

16. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Нясвіжскага раёна / рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 2001. – 632 с.

17. *Рыбчонак, С. А.* Дванаццаць апосталаў / С. А. Рыбчонак // Вяртанне-3 : зб. арт. і дак. / Беларус. фонд культуры. – Мінск, 1996. – С. 232–237.

18. *Сыракомля, У.* Добрыя весцi. Паэзія, проза, крытыка / У. Сыракомля. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 526 с.

19. *Чичагов, П. В.* Письма адмирала Чичагова к Александру I / П. В. Чичагов ; сообщ. М. И. Богдановичем. – СПб., 1831. – 218 с.

20. *Шишигина-Потоцкая, К. Я.* Легенды Несвижа : ист.-краевед. очерк / К. Я. Шишигина-Потоцкая. – 2-е изд. – Барановичи : Баранович. укрупн. тип., 2003. – 72 с.

21. *Шумейко, М. Ф.* Архивоведение Беларуси : учеб. пособ. для студентов ист. фак-тов вузов : в 2 ч. / М. Ф. Шумейко, К. И. Козак, В. Д. Селеменев. – Минск : Изд. центр РИВШ, 1997. – Ч. 1. – 101 с.

22. *Шумейко, М. Ф.* Война 1812 года и белорусские архивы / М. Ф. Шумейко // Фр. рэвалюцыя і лёсы свету : мат. Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. гадавіне Фр. рэвалюцыі (1789–1799), 21–22 крас. 1999 г., Мінск / рэдкал.: У. С. Кошалеў (адк. рэд.) і інш. – Мінск : БДУ, 1999. – С. 159–160.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

23. *Шышыгіна-Патоцкая, К. Я.* Нясвіж і Радзівілы / К. Я. Шышыгіна-Патоцкая. – Мінск : Полымя, 2001. – 240 с.

24. *Шышыгіна-Патоцкая, К. Я.* Скарбы Нясвіжа / К. Я. Шышыгіна-Патоцкая. – Мінск : Полымя, 1993. – 192 с.

25. *Яніцкая, М. М.* Драматычныя лёсы каштоўнасцей Нясвіжскага замка / М. М. Яніцкая // Вяртанне-2: арт., дак. і архіўныя мат. па праблемах пошуку і вяртання нац. каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь / Беларус. фонд культуры. – Мінск, 1994. – С. 19–27.

УДК 793.38:[793.2+791.9]

# О СООТНОШЕНИИ КАТЕГОРИЙ «БАЛ», «СОБЫТИЕ», «ПРАЗДНИК» В ФОРМАТЕ БАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЫ

***И. В. Ефремова,*** *кандидат искусствоведения, доцент, доцент кафедры режиссуры учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация.** Статья посвящена категориальному анализу триады «бал – событие – праздник», в ходе которого автором выявлено историческое существование двух типов бала – празднично-событийного и непраздничной-внесобытийного. Первый интерпретируется как праздничное мероприятие по случаю какого-либо торжественного или радостного события государственного или личного уровня. Второй – как внепраздничное мероприятие увеселительно-развлекательного плана, характеризующееся приподнятым эмоциональным состоянием и являющееся одной из досуговых форм повседневности. В отличие от балов первого типа, мотивом для организации которых является событие, поводом для бальных мероприятий второго типа служит стремление искусственно преодолеть однообразие повседневности посредством создания иллюзии праздничного времяпрепровождения. При этом и балы, рожденные праздничной культурой, и бальные мероприятия внепраздничного характера объединяются общим состоянием душевного подъема.

**Ключевые слова:** бал, событие, праздник, бальная культура.

# ABOUT THE RATIO OF THE CATEGORIES «BALL», «EVENT», «HOLIDAY» IN THE FORMAT OF BALLROOM CULTURE

***I. Efremova,*** *PhD in Art History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Directing of the Educational Establishment «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article is devoted to the categorical analysis of the triad «ball – event – holiday». The historical existence of two types of ball – festive-event and non-holiday-extra-event – have been identified. The first is interpreted as a festive event

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ